Аддзел па адукацыі
Сенненскага раённага
выканаўчага камітэта

Отдел по образованию
Сенненского районного
исполнительного комитета

ЗАГАД

ПРИКАЗ

30.01.2025 № 36 ад

г.Сенно

г.Сянно

Аб правядзенні раённага этапу
Рэспубліканскага конкурсу
”Праз творчасць у прафесію жыцця“

У адпаведнасці з пісьмом галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ”Аб удзеле ў абластным этапе Рэспубліканскага конкурсу ”Праз творчасць у прафесію жыцця“ ад 21.01.2025 № 01-01-37/100 з мэтай стымуляванне пазнавальнай актыўнасці, духоўнага ўзбагачэння асобы навучэнца праз садзейнічанне свядомаму выбару сферы будучай прафесійнай дзейнасці

ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці са студзеня па жнівень 2025 года раённы этап Рэспубліканскага конкурсу ”Праз творчасць у прафесію жыцця“ (далей – конкурс).

2. Зацвердзіць:

2.1. склад арганізацыйнага камітэта конкурсу (з правамі журы) (Дадатак 1);

2.2. палажэнне аб правядзенні конкурсу (Дадатак 2).

3. Дырэктару дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі ”Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і молодзі“ Ціханавай В.У. забяспечыць арганізацыйна-метадычную і інфармацыйную падтрымку конкурсу.

4. Кіраўнікам установ агульнай сярэдняй адукацыі, дадатковай адуацыі дзяцей і молодзі забяспечыць удзел навучэнцаў ва ўзросце 12-17 гадоў у конкурсе.

5. Кантроль за выкананнем загада ўскласці на метадыста дзяржаўнай установы ”Сенненскі раённы вучэбна-метадычны кабінет“ Ухваронка Дз.А.

Намеснік начальніка аддзела С.М.Рубанава

Шушкевіч А.В. 5 55 62
Падалінская В.А. 5 55 62

Дадатак 1

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад намесніка начальніка аддзела па адукацыі Сенненскага раённага выканаўчага камітэта
30.01.2025 № 36 ад

СКЛАД
арганізацыйнага камітэта (з правамі журы) раённага этапу Рэспубліканскага конкурсу ”Праз творчасць у прафесію жыцця“

| | |
|---|---|
| | старшыня журы |
| Ухваронак Дзмітрый Алегавіч | – метадыст дзяржаўнай установы ”Сенненскі раённы вучэбна-метадычны кабінет“; |
| | члены журы: |
| Ціханава Вольга Уладзіміраўна | – дырэктар дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі ”Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“; |
| Шушкевіч Анастасія Вітальеўна | – намеснік дырэктара дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі ”Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“; |
| Каржыцкая Валянціна Віктараўна | – загадчык аддзяленнем установы дадатковай адукацыі ”Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“; |
| Падалінская Вольга Аляксандраўна | – загадчык аддзяленнем дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі ”Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“. |

Дадатак 2

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад намесніка начальніка аддзела па адукацыі Сенненскага раённага выканаўчага камітэта
30.01.2025 № 36 ад

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні раённага этапу Рэспубліканскага конкурсу ”Праз творчасць у прафесію жыцця“

## I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Сапраўднае Палажэнне рэгламентуе парадак і ўмовы правядзення раённага этапу Рэспубліканскага конкурсу ”Праз творчасць у прафесію жыцця“ (далей – конкурс), патрабаванні да ўдзельнікаў і конкурсных работ, парадак іх прадастаўлення, тэрмін правядзення.

1.2. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца: аддзел па адукацыі Сенненскага раённага выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі ”Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“.

## II. МЭТА І ЗАДАЧЫ

2.1. Мэта: стымуляванне пазнавальнай актыўнасці, духоўнага ўзбагачэння асобы навучэнца праз садзейнічанне свядомаму выбару сферы будучай прафесійнай дзейнасці.

2.2. Задачы:

- сфарміраваць у навучэнцаў грамадзянска-патрыятычныя пачуцці і станоўчыя адносіны да працы;
- стымуляваць творчы патэнцыял навучэнцаў, уключаць іх у пошукавую дзейнасць, накіраваную на даследаванне характарыстык прафесіі;
- актывізіраваць прафесійнае самавызначэнне навучэнцаў, развіць іх сацыяльную актыўнасць, здольнасць да планавання сваёй прафесійнай будучыні.

## III. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ

3.1. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы ва ўзросце 12-17 годоў пад кіраўніцтвам педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

3.2. Удзел у конкурсе аўтаматычна мае на ўвазе азнаямленне і поўную згоду ўдзельнікаў з умовамі правядзення конкурсу.

## IV. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

4.1. Конкурс праводзіцца ў два этапы:

першы адборачны этап (студзень-сакавік 2025 года) – праводзіцца ва ўстановах адукацыі;

другі адборачны этап (красавік-жнівень 2025 года) – раённы. Прымаюць удзел пераможцы і прызёры першага адборачнага этапу.

## V. ПАТРАБАВАННІ ДА КОНКУРСНЫХ РАБОТ

5.1. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

- ”Ад захаплення да прафесіі жыцця“;
- ”Падарожжа ў свет прафесій“.

5.2. Удзельнікі конкурсу прадстаўляюць конкурсныя работы ў арганізацыйны камітэт у адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі:

у намінацыі ”Ад захаплення да прафесіі жыцця“ на конкурс прадстаўляецца тэкстава-ілюстрацыйны матэрыял, у які ўваходзяць:

- звесткі аб гісторыі, спецыфікі, значнасці, палажэнні на рынку працы абранай прафесіі;
- атрыбуты прафесіі (традыцыі, сімвалы, міфы, прафесіянальныя тэрміны і інш.);
- матывы выбару прафесіі і шляхоў вызначэння паспяховасці абранай прафесіі (у тым ліку) асобасных якасцяў;
- перспектывы і асобасная роля аўтара ў прафесіі.

Творчая работа ў намінацыі ”Ад захаплення да прафесіі жыцця“ можа суправаджацца ілюстрацыйным матэрыялам (фотаздымкамі, малюнкамі, схемамі, табліцамі і інш.).

Творчая работа выконваецца ў адпаведнасці з наступнымі патрабаваннямі фарматавання: аб’ём работы – не больш за 20 старонак фармату А4, тэкст работы друкуецца з дзвюх старонак ліста ў фармаце А4 з палямі: злева – 30 мм, справа – 10 мм, зверху і знізу – 20 мм у тэкставым рэдактары Word, шрыфт – Times New Roman, размер шрыфта – 14 пт, міжрадковы інтэрвал – адзінарны.

У намінацыі ”Падарожжа ў свет прафесій“ на конкурс прадстаўляецца мультымедыйная прэзентацыя з апісаннем прафесіі, якое дае найбольш поўнае ўяўленне аб абранай прафесіі, атрыбутах, умовах і прадметах працы, неабходных кампетэнцыях і іншая карысная інфармацыя аб прафесіі.

Патрабаванні да мультымедыйнай прэзентацыі:

- прэзентацыя павінна быць выканана ў праграме PowerPoint (пашырэнне файла .ppt, .pptx);

- на апошнім слайдзе даюцца спіс выкарыстанай літаратуры і спасылкі на крыніцы інфармацыі;

- прэзентацыя павінна захоўваць адзіны стыль (памер і колер шрыфта, напісанне, выраўноўванне);

- максімальная колькасць слайдаў – 20.

5.3. Конкурсные работы павінны мець тытульную старонку/слайд на рускай і беларускай мовах з пазначэннем поўнай назвы ўстановы адукацыі (без скарачэнняў), назвы конкурса/намінацыі, тэмы творчай работы, аб аўтары работы (прозвішча, імя, імя па бацьку, клас/аб’яднанне па інтарэсах) і аб кіраўніку (прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада).

5.4. Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ:

- адпаведнасць умовам конкурсу;

- адпаведнасць зместу работы заяўленай тэме;

- змястоўнасць, інфармацыйнасць, напоўненасць;

- выкарыстанне арыгівальных і творчых падыходаў у стварэнні і прадастаўленні матэрыялу.

## VI.ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАДАСТАЎЛЕННЯ РАБОТ НА КОНКУРС

6.1. Для ўдзелу ў раённым этапе конкурсу ў электронным выглядзе прадастаўляюцца:

- заяўка ўстаноўленага ўзору (Дадатак А);

- матэрыялы намінацыі: ”Падарожжа ў свет прафесій“;

Творчыя работы ў намінацыі ”Ад захаплення да прафесіі жыцця“ прадастаўляюцца ў друкаваным выглядзе.

Творчыя работы ў намінацыі ”Падарожжа ў свет прафесій“ прадастаўляюцца ў электронным выглядзе.

6.2. Матэрыялы для ўдзелу ў конкурсе, названыя ў пункце 6.1, неабходна прадставіць у Дзяржаўную ўстанову дадатковай адукацыі ”Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі“ па адрасе: rzdim@senno-edu.by, 211117, г.Сянно, вул.Машэрава, д.11 з пазнакай ”Праз творчасць у прафесію жыцця“, у тэрмін да 20 жніўня 2025 г.

Кансультацыі па пытаннях падрыхтоўкі, удзелу, афармлення конкурсных матэрыялаў праводзяцца па нумары тэлефона: 8(02135) 55562.

6.3. Па электроннай пошце ўсе конкурсныя матэрыялы адпраўляюцца адным лістом, папка з укладзенымі файламі перад адпраўкай архівуецца.

6.4. Адпраўка работ на конкурс з’яўляецца пацвярджэннем, што ўдзельнік конкурсу азнаёмлены з Палажэннем аб конкурсе і згодны з умовамі яго правядзення.

6.5. Паступленне конкурсных матэрыялаў будзе разглядацца як згода аўтара на магчымую публікацыю асобных матэрыялаў у сродках масавай інфармацыі.

## VII. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ

Па выніках працы конкурсу аргкамітэт вызначае пераможцаў і прызёраў. Пераможцы і прызёры конкурсу вызначаюцца ў кожнай намінацыі.

Журы пакідае за сабой права на вызначэнне колькасці прызавых месц у намінацыях.

Пераможцы і прызёры конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі аддзела па адукацыі.

Работы пераможцаў раённага этапа конкурсу накіроўваюцца для ўдзелу ў абласным этапе рэспубліканскага конкурсу.

## VIII. ФІНАНСАВАННЕ

Забеспячэнне дыпломамі (у электронным варыянце) – Сенненскі раённы цэнтр дзяцей і моладзі.

Дадатак А

ЗАЯЎКА
на ўдзел у раённым этапе рэспубліканскага конкурса творчых работ
”Праз творчасць у прафесію жыцця“

Намінацыя ”Ад захаплення да прафесіі жыцця“

| № п/п | Назва работы | Прозвішча, імя аўтара | Установа адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада кіраўніка, кантактны нумар тэлефона |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Намінацыя ”Падарожжа ў свет прафесій“

| № п/п | Назва работы | Прозвішча, імя аўтара | Установа адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку, пасада кіраўніка, кантактны нумар тэлефона |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |